## Библиографические ссылки

1. Иванов К. И. Организаторская функция печати: дис. ... канд. филол. наук : 10.01.10 / Белорусский ордена Трудового Красного Знамени государственный университет имени В. И. Ленина. Минск, 1988. 147 с.
2. Портянкин И. А. Основные функции и принципы партийной и советской печати. М. : Изд-во Моск. ун-та, 1955. 55 с.
3. Копяк Л. И. Функции печати нового типа. Свердловск : Уральск. гос. у-нт, 1974. 114 с.
4. Ганичев В. Н. Молодежная печать: история, теория и практика. М. : Мысль, 1976. 286 с.
5. Труфанова С. В. Формы проявления организаторской функции советской прессы // Вестник Моск. ун-та. Сер. 11, Журналистика. 1973. № 3. С. 3–11.
6. Корконосенко С. Г. Основы журналистики : учебник для вузов. М. : Аспект Пресс, 2001. 287 с.


# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ПАЛІТЫКА: ДАМІНАНТЫ СВЕТАПОГЛЯДУ ЖУРНАЛІСТА


***В. П. Вараб'ёў***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, Мінск, 220004, Рэспубліка Беларусь,*
*vorobyov57@gmail.com*



У артыкуле аналізуецца сістэма светапоглядных дамінантаў, якімі карыстаюцца і кіруюцца журналісты Беларусі ў працэсе рэалізацыі інфармацыйнай палітыкі дзяржавы.



***Ключавыя словы:*** дамінанты светапогляду; журналісцкая дзейнасць; інфармацыйная палітыка.


# INFORMATION POLICY: THE DOMINANT WORLDVIEW OF A JOURNALIST


***V. P. Vorobyov***

*Belarusian state University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: V. P. Vorobyov (vorobyov57@gmail.com)*



The article analyzes the system of the ideological dominance enjoyed by and guided by Belarusian journalists in the process of implementation of state information policy.



***Keywords:*** dominant worldview; journalism; information policy.

Дзяржаўная інфармацыйная палітыка, яе фарміраванне і рэалізацыя вылучаны на пярэдні план стратэгіі краіны ў Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь [1]. Для журналісцкай супольнасці гэты дакумент акрэслівае вострую патрэбу дзяржавы, грамадства, асобы ў павышэнні эфектыўнасці інфармацыйнага забеспячэння дзяржаўнай палітыкі. Адлюстравана пільная ўвага да кадравага патэнцыялу ў інфармацыйнай галіне, якую сілкуе факультэт журналістыкі БДУ. Прэзентавана неадкладная неабходнасць комплекснага ўдасканалення і мадэрнізацыі сістэмы фарміравання і рэалізацыі інфармацыйнай палітыкі дзяржавы. У гэтай сувязі звышактуальным з'яўляецца разгляд сістэмнага мінімуму светапоглядных дамінант, якімі карыстаюцца і кіруюцца ў штодзённай дзейнасці журналісты Беларусі ў працэсе рэалізацыі інфармацыйнай палітыкі дзяржавы.

Аб'ектна-прадметная галіна даследавання інфармацыйнай палітыкі канцэнтруецца на заканамернасцях развіцця інфармацыйнай сферы, сацыяльных інфармацыйных адносінах. Яны відавочна ўключаюць дзяржаўнае рэгуляванне інфармацыйнай сферы, камунікацыйна-прававога становішча грамадскай думкі і сістэмы сродкаў масавай інфармацыі [2]. Медыйная дзейнасць, што адлюстроўвае, прэзентуе і абараняе правы асобы, інтарэсы грамадства і палітыку дзяржавы, забяспечана сістэмай светапоглядных арыенціраў. Гэтыя сацыяльныя і дзяржаўныя каштоўнасці прадугледжваюць механізмы дасягнення пэўных мэтаў і прынцыпаў, прыярытэтаў і накірункаў дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі.

**Мэта** дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі Беларусі грунтуецца на канстытуцыйных гарантыях і канцэптуальна-дактрынальных высновах дырэктыўных дакументаў. Трыадзінства мэты фармулюецца дакладна: а) забеспячэнне палітычнай самастойнасці дзяржавы, захаванне духоўных і культурных каштоўнасцяў беларускага грамадства, у цэлым нацыянальных інтарэсаў краіны; б) развіццё масавай палітычнай свядомасці грамадзян, павышэнне патэнцыялу і якасці дзяржаўнага кіравання і іміджу Беларусі; в) рэалізацыя канстытуцыйных правоў грамадзян на атрыманне інфармацыі і яе распаўсюджванне.

З мэтай дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі арганічна звязаны і змястоўна дапаўняюць характар яе рэалізацыі **прынцыпы**, якія абумоўліваюць пэўныя светапоглядныя арыенціры. Першым прынцыпам выступае **інфармацыйны суверэнітэт** як сістэма прававога рэгулявання інфармацыйнай галіны з мэтай устойлівага развіцця краіны і забеспячэння сацыяльнай справядлівасці і палітычнай згоды ў грамад-

стве. Ён прадугледжвае стымуляванне ў медыя крытычных адносін да праяў непавагі нацыянальных традыцый і да парушэнняў норм маралі і права. Складнікамі прынцыпу інфармацыйнага суверэнітэту з’яўляюцца нецярплівасць СМІ да дэзынфармацыі і да інфармацыйных маніпуляцый; палітычнае забеспячэнне межаў дзейнасці замежных інфармацыйных суб’ектаў і дзяржаўныя захады супраць **інфармацыйнай экспансіі** знешніх медыя. Другім прынцыпам з’яўляецца інфармацыйны нейтралітэт у міжнародным абмене інфармацыяй як адмаўленне ад аспрэчвання палітычных, эканамічных і духоўных стандартаў іншых дзяржаў.

Трэці прынцып зместу дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі – **інфармацыйная бяспека** як стан абароненасці збалансаваных інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы ад знешніх і ўнутраных пагроз у інфармацыйнай сферы.

Акрамя мэты і прынцыпаў ажыццяўлення дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі ў Беларусі сфармуляваны і **прыярытэты** дзяржаўных медыя ў інфармацыйным працэсе. Безумоўна важным з’яўляецца прасоўванне ў СМІ **жыццёвых прыярытэтаў** краіны: гуманізм, міралюбства, добрасуседства, справядлівасць, узаемадапамога, сямейны ўклад, здаровы лад жыцця, стваральная праца, пазітыўная правасвядомасць. Адлюстраванне ў медыя роўных правоў усіх без выключэння нацыянальнасцей, паважлівыя адосіны да ўсіх традыцыйных рэлігій.

**Грамадзянска-патрыятычны светапоглядны** вектар уваходзіць важным складнікам у прыярытэты дзейнасці медыя. Наступным лагічным прыярытэтам з’яўляецца актыўнае прасоўванне ў СМІ і пашырэнне сацыяльных функцый і камунікацыйных магчымасцяў **беларускай мовы** як элемента нацыянальнай культурыі інфармацыйнай устойлівасці нацыянальнай медыяпрасторы. Творчая рэалізацыя ў СМІ беларускай нацыянальнай гістарычнай канцэпцыі і **беларускай мадэлі памяці** гістарычнага мінулага краіны дапаўняе стратэгічны пералік прыярытэтаў.

Лагічная сістэма мэтаў, прынцыпаў, прыярытэтаў і накірункаў інфармацыйнай палітыкі заклікана стаць дамінантамі светапогляду журналістаў у іх штодзённай стваральнай дзейнасці на карысць медыясферы Беларусі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Концепция информационной безопасности Республики Беларусь // СБ. Беларусь сегодня. 2019. 21 марта.
2. Информационная политика / под общ. ред. В. Д. Попова. М. : Изд-во РАГС, 2016. 463 с.